**Водзыў**
**афіцыйнага апанента**
**доктара мастацтвазнаўства, прафесара**
**Кушнярэвіча Аляксандра Мікалаевіча**
**на дысертацыю А. М. Сінілы**
**«Сюжэтна-тэматычныя асаблівасці жывапісу**
**з даваенных калекцый музеяў Мінска»,**
прадстаўленую на суісканне
вучонай ступені кандыдата мастацтвазнаўства
па спецыяльнасці 17.00.04 – выяўленчае
і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва і архітэктура

1. **Адпаведнасць зместу дысертацыі спецыяльнасці і галіны навукі, па якіх яна прадстаўлена да абароны**

Па сваім змесце, метадам аналізу і атрыманых выніках дысертацыя А. М. Сінілы «Сюжэтна-тэматычныя асаблівасці жывапісу з даваенных калекцый музеяў Мінска» адпавядае спецыяльнасці 17.00.04 – выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва і архітэктура і галіне навукі – мастацтвазнаўства.

**2. Актуальнасць тэмы даследавання**

У сваёй працы суіскальнік А. М. Сініла даследуе такую цікавую тэму, як сюжэтна-тэматычныя асаблівасці жывапісу з даваенных калекцый музеяў Мінска. Зборы карцін Мінскага сацыяльна-гістарычнага музея і Дзяржаўнай карціннай галерэі БССР склаліся на працягу адносна кароткага перыяда 1919–1940 гг., але былі самымі буйнымі на тэрыторыі БССР і прадстаўлялі як уласна беларускае, так і замежнае выяўленчае мастацтва. Падчас Вялікай Айчыннай вайны калекцыі жывапісу згаданых музеяў перасталі існаваць.

Асноўная ўвага даследчыка накіравана на выяўленне сюжэтна-тэматычных асаблівасцей карцін, якія знаходзіліся ў двух найбуйнейшых музеях Мінска. Падчас даследавання было праведзена не толькі апісанне захаваных твораў з сучасных калекцый, але і максімальнае аднаўленне ранейшых збораў жывапісу, што з'яўляецца вельмі актуальным для беларускага мастацтвазнаўства. А. М. Сініла змог атрыбутаваць шмат твораў, якія раней былі малавядомыя ці ўвогуле невядомыя, вызначыўшы імёны мадэляў на партрэтах, мастакоў, гісторыю паходжання карцін.

**3. Ступень навізны вынікаў, атрыманых у дысертацыі, і навуковых палажэнняў, якія выносяцца на абарону**

Навуковая навізна дысертацыйнага даследавання А. М. Сінілы заключаецца ў тым, што нягледзячы на страту музейных калекцый аўтар упершыню ў беларускім мастацтвазнаўстве грунтоўна апісвае жанравую структуру і тэматыку жывапісу і стварае базу пазначэнняў (нумары, наклейкі, пячаткі, надпісы) на карцінах са згаданых збораў. База дадзеных бясспрэчна з'яўляецца істотным укладам для далейшых пошукаў страчаных твораў і іх рэстытуцыі на радзіму.

Суіскальнік адшукаў і ўвёў у навуковы зварот мноства твораў, аднесеных да ліку незваротна страчаных, якія сёння захоўваюцца ў музеях іншых краін, тым самым вярнуўшы карціны ў гісторыю беларускага мастацтва.

А. М. Сініла пераканаўча даводзіць, што спалучэнне розных метадаў даследавання і комплексны падыход у вывучэнні тэмы дазволіў паспяхова справіцца з пастаўленымі задачамі і прааналізваць сюжэтна-тэматычныя асаблівасці жывапісу з даваенных калекцый музеяў Мінска. Суіскальнік апрацаваў вялікую колькасць архіўных дакументаў з айчынных і замежных сховішчаў, што дазволіла больш дакладна рэканструяваць зборы жывапісу і лепей апісаць іх.

**4. Абгрунтаванасць і дакладнасць высноў і рэкамендацый, сфармуляваных у дысертацыі**

Асноўныя палажэнні і вынікі кандыдацкай дысертацыі А. М. Сінілы абгрунтаваны і маюць высокую навуковую ступень дакладнасці, абапіраючыся на крыніцы, якія налічваюць 206 пазіцый.

Дакладнасць вынікаў праведзенага даследавання забяспечана таксама паўнатой рэпрэзентацыі аб'екта і прадмета даследавання, комплексным падыходам да іх вывучэння, навуковай аргументаванасцю высноў, высокім узроўнем навукова-тэарэтычнага абагульнення, заснаванага на шматаспектным аналізе вывучаемай праблемы з шырокім прыцягненнем разнапланавых крыніц і ўласных даследаванняў дысертанта.

5. **Навуковая, практычная, эканамічная і сацыяльная значнасць вынікаў дысертацыі з указаннем рэкамендацый па іх выкарыстанні**

*Навуковая значнасць* вынікаў дысертацыйнага даследвання заключаецца ў тым, што:

– упершыню даказана, што даваенныя мінскія музеі, у прыватнасці Мінскі сацыяльна-гістарычны музей і Дзяржаўная карцінная галерэя БССР, мелі самыя вялікія калекцыі жывапісу;

– абгрунтавана, што фарміраванне калекцыі жывапісу ішло на працягу 1919–1940 гг. і ўключала тры этапы, у выніку чаго зборы склалі ўнікальны на тэрыторыі Беларусі комплекс твораў беларускага, рускага і заходнееўрапейскага мастацтва;

– вызначана жанравая структура твораў беларускага жывапісу з даваенных калекцый музеяў Мінска, прадстаўленая партрэтам, пейзажам, анімалістычным і іншымі жанрамі;

– ахарактарызаваны тэматычна-вобразныя асаблівасці твораў замежнага жывапісу з даваенных збораў музеяў Мінска.

*Практычнае значэнне* даследавання цалкам вынікае з рашэння задач, пастаўленых перад даследчыкам, з якімі ён паспяхова справіўся. Вынікі дысертацыйнага даследавання А. М. Сінілы былі выкарыстаны на практыцы ў дзейнасці Нацыянальнага музея-запаведніка «Нясвіж», Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі, Дзяржаўнай гісторыка-культурнай установы «Гомельскі палацава-паркавы ансамбль», Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь, а таксама шэрагу замежных музейных устаноў, дзе апынуліся творы з даваенных калекцый музеяў Мінска. Па выніках даследавання атрыманы тры акты ўкаранення.

*Сацыяльная значнасць* вынікаў дысертацыі заключаецца ў тым, што матэрыялы дысертацыі могуць быць выкарыстаны ў далейшым для выставачнай, экспазіцыйнай і экскурсійнай дзейнасці, пошуку і вяртанні страчаных карцін. У прыватнасці, на аснове даследавання складзены 50 фармуляраў на зніклыя творы мастацтва, якія былі пададзены Генеральнай пракуратурай Беларусі на пошук ў Інтэрпол.

**6. Апублікаванасць вынікаў дысертацыі ў навуковым друку**

Асноўныя вынікі даследавання прадстаўлены ў 26 публікацыях агульным аб'ёмам 22,33 аўтарскіх аркуша, якія былі цалкам самастойна выкананы суіскальнікам.

**7. Адпаведнасць афармлення дысертацыі патрабаванням ВАК РБ**

Афармленне дысертацыі і аўтарэферата А. М. Сінілы поўнасцю адпавядае патрабаванням ВАК Рэспублікі Беларусь. Дысертацыя суіскальніка, прадстаўленая да абароны, адпавядае навуковай кваліфікацыі, на якую прэтэндуе суіскальнік у галіне мастацтвазнаўства па спецыяльнасці 17.00.04 – выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва і архітэктура.

**8. Адпаведнасць навуковай кваліфікацыі суіскальніка вучонай ступені, на якую ён прэтэндуе**

Дысертацыя Анатоля Мікалаевіча Сінілы «Сюжэтна-тэматычныя асаблівасці жывапісу з даваенных калекцый музеяў Мінска» з'яўляецца завершаным, самастойным і навукова значным даследаваннем, якое мае тэарэтычную навізну і практычную каштоўнасць. Даследаванне ўносіць істотны ўклад у развіццё беларускай школы мастацтвазнаўства, у адукацыю ў галіне культуры і мастацтва, у мастацкую крытыку і сістэму мастацка-экспертнай дзейнасці краіны. Дысертацыйнае даследаванне А. М. Сінілы, прадстаўленае да абароны, адпавядае навуковай кваліфікацыі, на якую прэтэндуе суіскальнік, і адпавядае галіне навукі – мастацтвазнаўства і спецыяльнасці 17.00.04 – выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва і архітэктура.

**9. Заўвагі і пытанні па дысертацыі і аўтарэфераце**

Прынцыповых заўваг па дысертацыі і аўтарэферату да суіскальніка няма.

Ёсць наступная канкрэтная *заўвага*.

У параграфе пра шляхецкі партрэт апісваюцца некалькі партрэтаў князёў Радзівілаў з былой калекцыі Беларускага дзяржаўнага музея, але адсутнічае апісанне партрэтаў з Нясвіжскага замка, хаця вядома, што яны таксама былі перавезены ў Мінск.

Хацелася б задаць аўтару дысертацыі наступныя *пытанні*:

1. На вашу думку, калі параўнаць прыкладныя працэнтныя суадносіны, у сучасных беларускіх зборах захавалася больш карцін беларускіх мастакоў ці замежных? Чым можна патлумачыць гэта?

2. У якіх замежных сховішчах перспектыўна шукаць зніклыя беларускія творы?

**10. Высновы**

Дысертацыя суіскальніка А. М. Сінілы «Сюжэтна-тэматычныя асаблівасці жывапісу з даваенных калекцый музеяў Мінска» з'яўляецца самастойным навуковым даследаваннем, адпавядае ўстаноўленым патрабаванням.

Як нам падаецца, вучоная ступень кандыдата мастацтвазнаўства па спецыяльнасці 17.00.04 – выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва і архітэктура можа быць прысвоена А. М. Сінілу за:

– комплекснае даследаванне жанравай структуры і тэматычна-вобразных асаблівасцей твораў жывапісу з даваенных калекцый мінскіх музеяў;

– цэласную характарыстыку структурнага і тэматычнага складу жывапісных калекцый мінскіх музеяў даваеннага перыяду;

– стварэнне базы пазначэнняў (нумары, наклейкі, штампы, пячаткі, надпісы) на творах з даваенных калекцый мінскіх музеяў;

– апісанне і ўвядзенне ў навуковы зварот вялікай колькасці малавядомых ці ўвогуле невядомых твораў жывапісу і архіўных дакументаў па тэме дысертацыі, што істотна пашырае веды па гісторыі беларускага мастацтва;

– атрыбуцыю і ўдакладненне інфармацыі пра больш за 100 твораў з даваенных калекцый музеяў Мінска;

– складанне фармуляраў на зніклыя творы мастацтва для ўнясення ў міжнародную базу Інтэрпола.

Доктар мастацтвазнаўства, прафесар,
прафесар кафедры гісторыі і сацыяльных навук
Беларускага дзяржаўнага
ўніверсітэта замежных моў — А. М. Кушнярэвіч

Учреждение образования
«БЕЛОРУССКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ
УНИВЕРСИТЕТ ИНОСТРАННЫХ ЯЗЫКОВ»
Подпись А.М. Кушнярэвіча
УДОСТОВЕРЯЮ
Зам. Начальник отдела кадров БГУИЯ
(Т.С. [illegible])
«04» 06 2026 г.